# СКЛАДАНАЗАЛЕЖНЫ СКАЗ

# ПЫТАННІ:

1. Структура складаназалежных сказаў.

2. Падпарадкавальныя злучнікі і злучальныя словы, іх адрозненне.

3. Віды даданых частак і іх асаблівасці

4. Складаназалежныя сказы з некалькімі даданымі, іх разнавіднасці.

5. Знакі прыпынку ў складаназалежных сказах.

Складаныя сказы, у якіх пры дапамозе падпарадкавальных злучнікаў і злучальных слоў аб'ядноўваюцца сінтаксічна нераўнапраўныя састаўныя часткі, называюцца **складаназалежнымі сказамі.**

У структуру складаназалежных сказаў часцей за ўсё ўваходзяць дзве нераўнапраўныя часткі: **<u>галоўная і даданая</u>**, якая паясняе галоўную і сінтаксічна падпарадкавана ёй. Даданая частка складаназалежнага сказа можа залежаць не толькі ад галоўнай, але і ад другой даданай: *Сонца заходзіла, каб узысці над зямлёй, якая так прыгожа выглядае.*

Да адной галоўнай часткі могуць адносіцца некалькі даданых, якія пасняюць у галоўнай адно слова або розныя. Даданая састка можа адносіцца да якога-небудзь слова ў галоўнай або да ўсёй часткі: *Студэнты пятага курса, якія здаюць экзамен па беларускай мове, зайдзіце ў дэканат* (Да слова *студэнты*). *На вуліцы пасвятлела, хоць ужо надыходзіў вечар* (Да ўсёй часткі *На вуліцы пасвятлела* нягледзячы на што?).

Складаназалежныя сказы, у якіх дадаая частка паясняе ўсю галоўную, называюцца **расчлянёнымі**.

Складаназалежныя сказы, у якіх даданя частка паясняе асобныя члены галоўнай — **нерасчлянёнымі**.

Паміж галоўнай і дададнай часткамі складаназалежнага сказа выражаюцца розныя адносіны:

- <u>суб’ектныя</u> (дададная частка раскрывае сэнс дзейніка галоўнай);
- <u>прэдыкатыўныя</u> (дададная частка раскрывае сэнс выказніка галоўнай);
- <u>аб’ектныя</u> (дададная частка з’яўляецца разгорнутым дапаўненнем пры выказніку);
- <u>атрыбутыўныя</u> (дададная частка з’яўляецца разгорнутым азначэннем);
- <u>акалічнасныя</u> (дададная частка з’яўляецца разгорнутай акалічнасцю розных відаў).

Гэтыя адносіны афармляюцца пры дапамозе такіх лексіка-граматычных сродкаў, як ***злучнікі і злучальныя словы, парадак састаўных частак*** (дадаеная частка можа стаяць перад або пасля галоўнай, можа разбіваць галоўную), ***указальныя словы і значэнні і граматычныя формы выказнікаў састаўных частак***.

У залежнасці ад структуры і значэння дадзеныя часткі складаназалежнага сказа падзяляюцца на: дзейнікавыя, выказнікавыя, азначальныя, дапаўняльныя, акалічнасныя (месца, часу, прычыны, умовы, выніку, уступкі, спосабу дзеяння, меры і ступені, параўнання) і далучальныя.

**Злучальныя словы** — гэта адносныя займеннікі і прыслоўі *што, чым, як, калі* і інш., якія звязваюць дадзеную частку з галоўнай у складаназалежным сказе.

Злучальныя словы не трацяць свайго лексічнага значэння. Яны з'яўляюцца членамі сказа ў дададнай частцы.

***Параўнайце:***

*Я ведаю, што ты скажаш.* *Я ведаю, што ты скажаш няпраўду.*

У першым сказе слова *што* з'яўляецца дапаўненнем, у другім — злучнікам.

- **Запомніце!**
- **Толькі злучнікі:** *бо, таму, што, пакольκі, з прычыны таго што, ледзь, ледзь толькі, як толькі, тым часам як, каб, абы* (адрознівайце ад *або*), *калі – то, раз – то, для таго каб, хоць, хай, няхай, бы, нібы, нягледзячы на тое што, ці, быццам, так што, калі – дык* і інш.
- **Толькі злучальныя словы:** *хто, які, чый, колькі, наколькі, каторы, дзе, куды, адкуль, дакуль.*
- **І злучнікі, і злучальныя словы:** *што, як, калі, чым, пакуль.*

Для размежавання неабходна ведаць некалькі правіл:

- звычайна на злучальнае слова падае лагічны націск: *Я ведаю, як гэта зрабіць. Я ведаю, калі ты прыйдзеш. Я ведаю, чым гэта можа закончыцца*;
- у большасці выпадкаў, калі лагічны націск прыпадае на іншае слова, замест злучальнага слова ў дадзенай частцы можна падставіць слова з галоўнай часткі. Так, у сказе *Песню родную люблю я, што дзеўкі ў полі запяюць...* (К. Б.) замест злучальнага слова *што* ў дадзенай частцы можна падставіць слова *песню* з галоўнай часткі.

**ДАДАНАЯ ДЗЕЙНІКАВАЯ** — даданая частка складаназалежнага сказа, якая замяняе або канкрэтызуе дзейнік галоўнай часткі, выражаны ўказальным займеннікам *той* ці азначальнымі *кожны, усякі, усе, усё* або з'яўляецца разгорнутым дзейнікам да выказніка галоўнай часткі і аб'ядноўваецца з галоўнай пры дапамозе злучнікаў і злучальных слоў *хто, што, як, каб, калі, нібы, быццам і* інш.

Даданая дзейнікавая частка можа размяшчацца перад галоўнай, у сярэдзіне або пасля яе.

| Пытанні | Паясняе | Сродкі сувязі | Месца дадандай адносна галоўнай | Прыклады |
|---|---|---|---|---|
| Адказвае на пытанні ***назоўнага склону – хто? што?*** | **Канкрэтызуе дзейнік галоўнай часткі, выражаны ўказальным займеннікам *ко жны, той, усякі, усе, усё,* або з'яўляецца разгорнутым дзейнікам да выказніка галоўнай часткі.** | **Для сувязі даданай часткі з галоўнай ужываюцца злучальныя словы і злучнікі *хто, што, як і інш.*** | | ***Хто позна ходзіць, той (хто?) сам сабе шкодзіць.* У сказе даданая частка канкрэтызуе дзейнік, выражаны займеннікам *той*.**<br>***Чуваць (што?), як пашчоўквае мароз па тыне, па сухіх жэрдках плота.* У сказе даданая частка выконвае ролю разгорнутага дзейніка, якога няма ў галоўных частках.**<br>***Пачулася (што?), быццам нехта ходзіць па хаце.* У сказе даданая частка выконвае ролю разгорнутага дзейніка.** |

**ДАДАНАЯ ВЫКАЗНІКАВАЯ** — даданая частка складаназалежнага сказа, якая канкрэтызуе выказнік галоўнай часткі, выражаны займеннікамі *такі, гэтакі, той, усе* ў форме назоўнага (зрэдку творнага) склону. З галоўнай даданая выказнікавая частка звязваецца пры дапамозе пытальна-адносных займеннікаў *хто, што, які, чый* або злучнікаў *што, быццам, як быццам* і інш.

| Пытанні | Паясняе | Сродкі сувязі | Месца дадзенай адносна галоўнай | Прыклады |
| --- | --- | --- | --- | --- |
| Адказвае на пытанні *які іменна? якая іменна? які менавіта? што менавіта?* | **Канкрэтызуе значэнне выказніка галоўнай часткі, выражанага займеннікамі *той, такі, гэтакі, усё,* або раскрывае сэнс займенніка, што ўваходзіць у склад састаўнога іменнага выказніка.** | **Для сувязі дададзенай часткі з галоўнай ужываюцца злучальныя словы і злучнікі *хто, што, які, чый, як, быццам, каб нібы і інш.*** | **Дададзеная частка звычайна размяшчаецца пасля галоўнай, перад галоўнай – рэдка.** | ***Словы такія (якія іменна?), як некалі маці мне гаварыла.* У сказе дададзеная частка паясняе выказнік, выражаны займеннікам *такія.* *Чамусьці сёння цішыня такая (якая іменна?), што сэсці хочацца і патужыць.*** |

- **Увага!**

Дадзеныя <u>выказнікавыя сказы трэба адрозніваць ад падобных да іх азначальных</u>: дадзеныя азначальныя паясняюць займеннікі ***такі, той***, якія з'яўляюцца азначэннем у галоўным сказе.

**Параўнайце:**

*Лінуў* ***такі*** *дождж* *(****які?****),* ***што*** *вада праз сцены зацякала ў хату.* Дадзеная частка паясняе займеннік ***такі***, які з'яўляецца ў галоўнай частцы азначэннем, таму від дадзенай – дадная азначальная. *Якія грошы,* ***такі*** ***(які іменна?)*** *і повар.* Дадзеная частка паясняе ў галоўнай займеннік ***такі,*** які з'яўляецца выказнікам, таму від дадзенай – дадзеная выказнікавая.

**ДАДАНАЯ АЗНАЧАЛЬНАЯ** — даданая частка складаназалежнага сказа, якая часцей за ўсё адносіцца да назоўніка галоўнай часткі і абазначае яго прымету або паясняе ўказальныя словы (у ролі азначэння) *той, такі, гэтакі*, напаўняючы іх канкрэтным зместам. Граматычнымі сродкамі сувязі даданай азначальнай часткі з галоўнай у структуры складаназалежнага сказа з'яўляюцца злучнікі і злучальныя словы *які, каторы, чый, што, дзе, куды, адкуль, калі, каб, як бы, быццам* і інш.

| Пытанні | Паясняе | Сродкі сувязі | Месца даданай адносна галоўнай | Прыклады |
|---|---|---|---|---|
| Адказвае на пытанні *які? якая? якое? якія?* | Паясняе назоўнік у галоўнай частцы або канкрэтызуе значэнне ўказальных займеннікаў *той, такі, гэты, гэтакі,* якія з'яўляюцца ў галоўнай частцы азначэннямі. | Для сувязі даданай часткі з галоўнай ужываюцца злучальныя словы *які, што,* радзей – *чый, каторы, хто.* **Заўвага!** Калі даданая частка далучаецца да галоўнай злучальнымі словамі *дзе, куды, адкуль, калі, як* і злучнікамі *што, каб, нібы, як бы, быццам,* азначальныя адносіны ўскладняюцца акалічнаснымі – месца, часу, меры і ступені, мэты, параўнання. | Стаіць пасля галоўнай або ў сярэдзіне яе. | *Я люблю бярозку (якую?), што пяе з вятрамі.* У сказе даданая частка паясняе назоўнік *бярозку* і адказвае на пытанне *якую?* *Люблю наш край – старонку гэту (якую?), дзе я радзілася, расла.* У сказе даданая частка паясняе ўказальнае слова *гэту.* *Аднекуль з таго боку, куды ішла дарога, данёсся крык, абрывак нейкага голасу – вырваўся ў марозную ноч і прапаў.* У сказе даданая частка далучаецца да галоўнай злучальным словам *дзе* і ўскладняецца акалічнаснымі адносінамі месца. **Заўвага!** Злучальныя словы (адносныя займеннікі) могуць стаяць у сярэдзіне даданай: *Палкоўнік акінуў позіркам лагоднае ранішняе неба, цьмяная бясколернасць якога ўжо змянялася глыбокім і шырокім блакітам.* |

**ДАДАНАЯ ДАПАЎНЯЛЬНАЯ** — дадзеная частка складаназалежнага сказа, якая канкрэтызуе дапаўненне галоўнай часткі, выражанае субстантываваным указальным займеннікам *той* ці азначальнымі займеннікамі *кожны, усякі, усе, усё,* або выконвае ролю дапаўнення да выказніка галоўнай часткі. Дададаная дапаўняльная частка звязваецца з галоўнай пры дапамозе злучнікаў і злучальных слоў *хто, што, ці, які, дзе, куды, адкуль, калі, як, быццам, колькі* і інш.

| Пытанні | Паясняе | Сродкі сувязі | Месца даданай адносна галоўнай | Прыклады |
|---|---|---|---|---|
| Адказвае на пытанні *ўскосных склонаў* | Выконвае ролю дапаўнення да выказніка галоўнай часткі. Паясняе дзеяслоў-выказнік галоўнага сказа, можа паясняць і дапаўненне, выражанае ўказальным займеннікам *той* ва ўскосных склонах, азначальнымі займеннікамі к | Для сувязі даданай часткі з галоўнай ужываюцца злучальныя словы і злучнікі *хто, што, які, чый, як, адкуль і інш.* | Стаіць пасля галоўнай або ў сярэдзіне яе пасля слова, якое ёй паясняецца або канкрэтызуецца. | ***Мы хочам (чаго?), каб мірнае неба не знала пажараў вайны.*** У сказе даданая частка паясняе выказнік і выконвае ролю дапаўнення да выказніка *хочам*. ***Таго (чаго?), што зрабілася, назад не вернеш.*** У сказе даданая частка паясняе дапаўненне, выражанае ўказальным займеннікам *таго.* **Заўвага!** У канцы даданага дапаўняльнага сказа, які з'яўляецца ўскосным пытаннем, пытальнік не ставіцца: ***Пятро падышоў і спытаў у шафёра, ці можна пад'ехаць.*** Пытальнік ставіцца ў канцы сказа тады, калі пытанне выражаецца ў галоўнай |

# Увага!

- Даданыя дапаўняльныя неабходна адрозніваць ад даданых дзейнікавых. Каб размежаваць гэтыя даданыя часткі, трэба ўлічваць іх сінтаксічную ролю ў адносінах да галоўнай часткі і склонавую форму ўказальных слоў, якія канкрэтызуюцца даданай часткай.
- **Параўнаем сказы:**

1. *Усё (што?), што сабралася ў Сцяпане Фёдаравічу за горкія дні адступлення, рабіла яго нястомным, не давала спакою ў гэтыя дні.*

2. *Усё (што?), што мог знайсці і прачытаць пра мора, Кузьменка прачытаў.* У абодвух сказах даданая частка канкрэтызуе слова ***ўсё***, ад якога да яе ставіцца пытанне ***што***? Аднак у 1-м сказе ***ўсё*** – дзейнік, даданая частка – дзейнікавая; у 2-м – прамое дапаўненне, даданая частка – дапаўняльная.

# Увага!

- Калі ж у галоўнай частцы адсутнічаюць указальныя словы, тады ўлічваецца будова галоўнай часткі: калі галоўная частка – аднасастаўны сказ з выказнікам, выражаным словамі ***відаць*** **(*відно*)**, ***чуваць***, ***чуць*** **(*чутно*)**, зваротным дзеясловам, то даданая частка – <u>дзейнікавая</u>; калі галоўная частка – двухсастаўны сказ, то даданая частка – <u>дапаўняльная</u>. *Было відаць,* ***што*** *Піваварaў устрывожыўся раненнем камандзіра больш, чым знікненнем базы* (даданая дзейнікавая). *Я сню,* ***што*** *змораны хадой і не знаходжу шлях дадому* (даданая дапаўняльная).

**ДАДАНАЯ АКАЛІЧНАСНАЯ** — дададаная частка складаназалежнага сказа, якая замяняе або канкрэтызуе акалічнасць галоўнай часткі, па сваёй функцыі падобна да акалічнасці ў простым сказе, адказвае на тыя самыя пытанні, што і акалічнасць.

| Тып дaданай | Пытанні | Паясняе/ тлумачыць | Сродкі сувязі | Прыклады |
| --- | --- | --- | --- | --- |
| **Дадан ая месца** | ***дзе? куды? адкуль?*** | Паясняе акалічнасць месца ў галоўным сказе, выражаную прыслоўямі ***тут, там, туды, усюды, адтуль, адсюль, скрозь*** | Злучальныя словы ***дзе, куды, адкуль.*** | *Над галавой (**дзе?**), **дзе** ўчора вісела пахмурная смуга, цяпер глядзелася чыста-празрыстая сінь.*<br>*Адтуль (**адкуль?**), **дзе**спыніліся машыны, даносіліся мужскія галасы.* |

| Тып даданай | Пытанні | Паясняе/ тлумачыць | Сродкі сувязі | Прыклады |
|---|---|---|---|---|
| Даданая часу | ***калі? як доўга? да якога часу? з якога часу?*** | Паясняе выказнік або канкрэтызуе акалічнасць часу галоўнай часткі. | Злучнікі ***калі, як, пакуль,*** састаўныя злучнікі ***ў той час як, з той пары як, пасля таго як, перад тым як, да таго часу калі.*** У ролі злучнікаў ужываюцца таксама часціцы ***ледзь, толькі, ледзь толькі*** або часціцы ў спалучэнні са злучнікамі ***як толькі, толькі што, чуць што.*** | *Дружба сапраўдная пачынаецца тады (**калі?**), **калі** людзі як мае быць ведаюць адзін аднаго.* ***Пакуль*** *Сцёпка гойсаў па аколіцы з сябрамі, Мірон Патапавіч на адзіноце думаў пра сваё.* ***Як толькі*** *спуталі коней, падлеткі пачалі раскладваць (**калі?**) агонь.* *Прыемна глядзець на гэтае поле **летам (калі?), калі** пад лёгкім ветрам угінаецца зялёная лава жыта.* |

| Тып даданай | Пытанні | Паясняе/ тлумачыць | Сродкі сувязі | Прыклады |
| --- | --- | --- | --- | --- |
| Даднaя прычыны | *чаму? з якой прычыны?* | Раскрывае прычыну таго, пра што гаворыцца ў галоўнай частцы. У галоўнай частцы могуць быць указальныя словы *ад таго, таму, затым.* | Злучнікі *бо, таму што, што, а то* і інш. | ***Сканіўся дзядзька яму нізка (чаму?), бонадта добрым аказаўся. Часта прыходзілася спыняцца (чаму?), таму штодарога была несамавітая. Вы б раздзеліся (чаму?), а то яшчэ гадзіну чакаць. І яшчэ тамуБагдановіч бачыў далей (чаму?), што ён ніколі не страчваў веры ў неадольнасць чалавечага руху наперад.***<br>**Увага!**<br>**Часта словы *таму што* раздзяляюцца: указальнае слова *таму* стаіць у галоўным сказе, а злучнік *што* – у даданым. У такім выпадку на слова *таму* падае лагічны націск, коска ставіцца перад *што*: *Вы абмінаеце асенні лес таму, што вецер абарваў лістоту.*** |

| Тып даданай | Пытанні | Паясняе/ тлумачыць | Сродкі сувязі | Прыклады |
| --- | --- | --- | --- | --- |
| Даданая ўмовы | *пры якой умове?* | Паказвае, пры якіх абставінах можа адбывацца або адбываецца дзеянне, названае ў галоўнай частцы. | Адзіночныя злучнікі *калі, як, каб, раз,* парныя злучнікі *калі…дык, раз…то, як…то.* | *Куды жывецца весялей (пры якой умове?), калі сябры навокал. Наўрад ці страляў бы ён зараз (пры якой умове?), каб і зараджанай была яго стрэльба.*<br>**Увага!**<br>Галоўны сказ можа пачынацца словамі *то, дык*, калі ён стаіць пасля даданага*: Калі ж смяецца грамада, тосмех такі гаворыць многа. Калі справа не пад сілу, дык на плечы не бяры.* |

| Тып даданай | Пытанні | Паясняе/ тлумачыць | Сродкі сувязі | Прыклады |
| --- | --- | --- | --- | --- |
| Дадан ая мэты | *для чаго? з якой мэтай? навошта?* | Раскрывае мэту або прызначэн не таго, пра што гаворыцца ў галоўнай частцы. У галоўнай частцы могуць быць указальныя словы *для таго, з той мэтай.* | Злучнікі *каб, для таго каб, не тое каб, з тым каб.* | *Многа нам вучыцца трэба (для чаго?), кабпазнаць зямлю і неба. Лістамі сцеле вожык норку (навошта?), кабцёпла ў ёй зімой было. Калгаснікі сабраліся на сход для таго, кабабмеркаваць неабходныя пытанні.* |

| Тып даданай | Пытанні | Паясняе/ тлумачыць | Сродкі сувязі | Прыклады |
|---|---|---|---|---|
| Даданая ўступальная | *нягледзячы на што?* | Далучаецца да ўсёй галоўнай часткі. Змест даданай часткі супярэчыць фактам, з'явам, падзеям, пра якія паведамляецца ў галоўнай. | Злучнікі *хоць, хай, нягледзячы на тое што,* часціца *няхай (хай),* злучальныя словы *дзе, куды, як, хто, што* ў спалучэнні з часціцай *ні.* Таксама могуць ужывацца злучнікі *а, але.* | *Сябры звярнулі на сцежку* ***(нягледзячы на што?),*** *хоць у гэтым патрэбы не было. Хоць ад ракі цягнула свежасцю, вогнішчаў не распальвалі. Як ніўглядаўся Гардзей удалячынь, але на дарозе нікога не было відаць. Хай цяпер цяжкавата, але жбачна надзея.* <br> Заўвага! <br> Ад даданага ўступальнага сказа трэба адрозніваць адасобленую акалічнасць са значэннем уступкі, выражаную спалучэннем слоў з прыназоўнікам *нягледзячы на*: *Нягледзячы на позні час, ніхто з пасажыраў не спаў* (просты сказ з адасобленай акалічнасцю). |

| Тып даданай | Пытанні | Паясняе/ тлумачыць | Сродкі сувязі | Прыклады |
|---|---|---|---|---|
| Даданая спосабу дзеяння | *як?* | Раскрывае ў галоўнай частцы значэнне акалічнасці, выражанай прыслоўем *так*, або паясняе выказнік галоўнай часткі, паказваючы на характар, спосаб ажыццяўлення дзеяння. | Злучнікі *што, як, быццам, нібы, каб*, якія паказваюць таксама на дадатковыя адценні, што могуць мець гэтыя часткі: выніку (*што*), параўнання (*як, быццам*), мэты (*каб*). | *Чыгункі, аўтамабільныя дарогі, самалёты зрабілі так, што рэкі нібы замёрлі. Сцюжа патыхнула на яе праз разбітае акно так, што Васіліна аж сцялас* |

| Тып даданай | Пытанні | Паясняе/ тлумачыць | Сродкі сувязі | Прыклады |
|---|---|---|---|---|
| Даданая меры і ступені | *у якой ступені? як многа?* | Канкрэтызуе ў галоўнай частцы значэнне ўказальных слоў, якія паказваюць на меру або ступень праяўлення дзеяння, прыметы: *так, столькі, настолькі, такі, гэтакі, да такой меры, да такой ступені, да таго.* | Злучнікі і злучальныя словы *колькі, наколькі, што, як, быццам.* | *Зямлю бацькоў я таклюблю, штоненавідзець маю права. Колькі чалавек у сям'і, столькі дрэў садзіць маленькі чалавек, стаўшы вучнем школы Сухамлінскага. Да нас прыйшло так многа народу (як многа?), што зала не ўмяшчала ўсіх.*<br>Увага!<br>Даданыя способу дзеяння і ступені могуць звязвацца з галоўным сказам злучнікам *каб.* У такіх сказах выражаецца дадатковае адценне мэты: *Мы павінны працаваць так, каб за нас радаваліся бацькі і сябры.* |

| Тып даданай | Пытанні | Паясняе/ тлумачыць | Сродкі сувязі | Прыклады |
|---|---|---|---|---|
| Даданая параўнальная | | Адносіцца да ўсёй галоўнай часткі і паясняе яе шляхам параўнання | Злучнікі *як, нібы (бы), быццам, як быццам, як бы, чым* і інш., могуць ужывацца парныя злучнікі *чым – тым*. | ***Як пчала мёд збірае рупна ў соты, збіраем скарб з зямлі і з-пад зямлі. Слядок з слядочкам супадае, былапка тут адна ступае. Чым далей падаваўся я ў гэты лес, тым усё болей глушэла.***<br>**Увага!**<br>**Да параўнальных сказаў падобны параўнальныя звароты, якія з'яўляюцца членамі простага сказа. На пісьме яны, як і сказы, выдзяляюцца коскамі: *Ляцяць, як стрэлы, ластаўкі. Думкі ўюцца, нібы пчолы.*** |

У складаназалежных сказах можа быць не адна, а дзве і больш даданых частак, якія па-рознаму звязаны з галоўнай часткай і паміж сабой.

Такія сказы называюцца **складаназалежнымі з некалькімі даднымі**.

[1] Я змалку зведаў, [2] як гамоняць рэкі, [3] як ціха плачуць вербы над вадой.

што?

[[1] -х-], ([2] як ), ([3] як ).

Да галоўнага сказа адносяцца два даданыя дапаўняльныя сказы.

[1]Саўка не думае, [2]што будзе далей, [3]калі ён вернецца з лесу.

пра што? калі?

[[1] -х-], ([2] што х ), ([3] калі ).

Першы даданы сказ – дапаўняльны, другі – даданы часу і залежыць ад першага даданага.

Складаназалежныя сказы з некалькімі даданымі па сваёй будове падзяляюцца на сказы з **паслядоўным, сузалежным і змешаным падпарадкаваннем**.

У складаназалежных сказах з паслядоўным падпарадкаваннем простыя сказы звязаны наступным чынам: ад галоўнага сказа залежыць першы даданы сказ, ад яго залежыць другі даданы сказ, ад другога – трэці і г.д., паміж галоўным і даданым, а таксама паміж наступнымі даданымі сказамі ставіцца коска.

Напрыклад:

***Мы гаворым пра мір і страсна змагаемся за яго, бо ведаем, што такое вайна.***

чаму? што?

бо што

[$^{1}$-**х**-], ($^{2}$ бо -**х**-), ($^{3}$ што ).

Другая частка залежыць ад першай, трэцяя – ад другой, паміж 2-й і 3-й часткамі ставіцца коска.

Пры паслядоўным падпарадкаванні адзін дададны сказ можа стаяць у сярэдзіне другога даданага.

**Напрыклад:**

$^{1}$***Сашы здаецца, што яна чуе,*** $^{2}$***як малады клён,*** $^{3}$***што расце пад акном,*** $^{2}$***п'е сок зямлі.***




[$^{1}$-х-], ($^{2}$ -х-, ($^{3}$ ), $^{2}$ ).

Калі падпарадкавальныя злучнікі ў такім сказе стаяць побач (***што* і *калі, якія* і *калі***), то перад кожным злучнікам ставіцца коска.

**Напрыклад**: *Ужо такі быў гэты чалавек,* ***што,*** ***калі*** *закарціць у яго якое жаданне, ён даможацца свайго.*

Другому злучніку могуць адпавядаць словы ***то, дык*** (***калі – то, калі – дык***); у такім выпадку перад другім злучнікам коска не ставіцца.

**Параўнайце**: *Ужо такі быў гэты чалавек,* ***што калі*** *закарціць у яго якое жаданне,* ***дык*** *ён даможацца свайго.*

**Запомніце!**

Два злучнікі – тры коскі, тры злучнікі – дзве коскі.

У складаназалежным сказе ад аднаго галоўнага сказа могуць непасрэдна залежаць два ці некалькі даданых сказаў.

Існуе дзве разнавіднасці такіх сказаў:

Складаназалежныя сказы, у якіх даданыя часткі адносяцца да агульнага для іх галоўнага сказа, паясняюць у ім адно і тое ж слова ці спалучэнне слоў і з'яўляюцца **аднолькавымі па значэнні**. Такія даданыя сузалежныя сказы называюцца ***аднароднымі***.

- **Напрыклад:**
- [1]***Я чую***, [2]***як шумяць пшаніцай нівы***, [3]***як б'юцца сэрцы фабрык і заводаў***, [1]***як наш народ, свабодны і шчаслівы, куе свой лёс упарта год ад году***.



**УВАГА!**

а) падпарадкавальны злучнік у адным з дадзеных сказаў можа быць апушчаны.

**Напрыклад:** *Край мой там,* ***дзе*** *шэпчуць сосны, шумяць волаты-дубы.*

б) аднароднымі лічацца і такія даданыя сузалежныя сказы, якія паясняюць у галоўным сказе аднародныя члены.

**Напрыклад:** *Шкада мне зялёнай нівы,* ***што*** *шуміць у полі, такога дуба,* ***што*** *над рэчкай песціцца ў прыволлі.*

Калі аднародныя даданыя сказы звязаны паміж сабой адзіночнымі злучнікамі ***і, ды, ці, або***, то перад гэтымі злучнікамі, як і пры аднародных членах, коска не ставіцца.

**Напрыклад:** *Глушэц пачынае такаваць на досвітку,* ***калі*** *вакол цёмна* ***і*** *лес яшчэ не абудзіўся.*

*Алесь не ведаў,* ***што*** *за ім сочаць* ***і што*** *цяпер на яго непрыкметна глядзяць дзве пары вачэй.*

*Там,* ***дзе*** *раней ляжалі хмызнякі* ***або*** *жаўцеў голы пясок, раслі стройнымі радамі маладыя сасонкі.*

Ёсць складаназалежныя сказы, у якіх даданыя адносяцца да агульнага для іх галоўнага сказа, паясняюць у ім розныя словы або адно і тое ж слова, але з’яўляюцца **рознымі па значэнні**, адказваюць на розныя пытанні. Такія даданыя сузалежныя сказы называюцца **неаднароднымі**.

## Напрыклад:

*Калі падымалася сонца, пачыналася гарачыня, якая трымалася да позняга вечара.*




Першы даданы сказ (часу) паясняе ў галоўным сказе дзеяслоў-выказнік пачыналася і адказвае на пытанне ***калі?***; другі даданы (азначальны) паясняе назоўнік *гарачыня* і адказвае на пытанне ***якая?***).

У адным сказе можа быць **змешанае падпарадкаванне** даданых сказаў – сузалежнае і паслядоўнае.

**Напрыклад:**

*Мы накіраваліся да сядзібы, якая тоне ў зеляніне дрэў, каб паглядзець на двор, на тыя шыбы, у якія некалі і ён глядзеў.*




З галоўным сказам першы і другі даданыя сказы звязаны сузалежным неаднародным падпарадкаваннем, а другі і трэці даданыя сказы – паслядоўным падпарадкаваннем.

# Дзякуй за ўвагу!